Ганна Атрошчанка

# СУСТРЭЧА

Проза

Гомель
РПУП «Палесдрук»
2002

УДК 882. 6-1
ББК 84(4Беи)6
А92

**Атрошчанка Г.**

А92 Сустрэча: Проза. — Гомель: РПУП «Палесдрук», 2002.—64 с.
ISBN

Чарговая кніжка прозы "Сустрэча" Ганны Атрошчанка распавядае пра нашае жыццё, дзе можна пабачыць шмат чаго смешнага і цікавага. Бо без гэтага сёння немагчыма пражыць на зямлі! Героі твораў Ганны Мікалаеўны – звычайныя людзі, са сваімі спадзяваннямі, турботамі.

Думаецца, "Сустрэча" знойдзе сваіх прыхільнікаў і спадабаецца.

**УДК 882.6-1**
**ББК 84(4Беи)6**

ISBN 985-6632-17-X @ Г. М. Атрошчанка, 2002

# ЖАНОЧАЯ ХІТРАСЦЬ

Усё было б добра ў сямейным жыцці Пятра, каб толькі не жончыны выкрутасы. А справа была вось у чым: як толькі зазірне ён з жонкай на сваю фазэнду, дык маладзіца шусне кудысьці, быццам праз зямлю праваліцца. Ну, а потым вяртаецца пад добрым "газам", ды толькі рохкае, як парася...

Пятрусь тады ўзніме лямант на ўсю хату. Ды дзе там! Як з гуся вада. Муська толькі асалавелымі вочкамі лыпае, зяпу адкрывае, нешта мармыча ў сваё апраўданне.

Ніяк не мог уцяміць працавіты муж, дзе бярэ гарэлку гэтая п'яніца. Здаецца ж, як збіраецца на дачу, усё перасатрасе і нічога не знойдзе. Але ж, як мовіцца, шыла ў мяшок не схаваеш! Аднойчы, затрымаўшыся ў прыбіральні, Пятро звярнуў ўвагу на нейкую вяроўчыну, якая "забегла" ў адметную дзірку. З агідай зазірнуў туды і аслупянеў ад нечаканасці: унізе боўталася бутэлька з гарэлкай.

Як кажуць, што, маўляў, хіцер Зміцер, але ж і Саўка не дурань. Таму Пятро зрабіў так: выцягнуўшы запэцканую

ёмкасць, хуценька выліў вадкасць і напоўніў звычайнай вадой. Няхай цяпер пасмакуе ад пуза! Бо маладзіца ўжо не ведае, з якога боку пачынаюцца соткі...

## НАРОДНАЯ ПРЫКМЕТА

Танька была самай старэйшай у вялікай сялянскай сям'і. Таму з дзяцінства налаўчылася рабіць самую складаную працу, ніколі не ленавалася. Усё ў руках дзяўчыны літаральна "гарэла", бо ніхто – нават маці! – не вучылі Таццяну вышываць, вязаць, шыць... Дзіўна, але гэткія жаночыя сакрэты дзеўка занатоўвала ў памяці.

Вядома ж, дарослыя цёткі толькі дзівіліся, прыгаворвалі: маўляў, кемлівая ды працавітая дзеўка расце ў Мар'і! Добрая камусьці пападзецца жонка – умелая, спагадлівая.

Так мінаў час. Танька занявесцілася, расквітнела, бы тая красачка на лузе. Такія перамены адразу ўбачылі маладыя дзяцюкі, хлопцы. Зыркаючы ўслед прыгажуні, марылі аб узаемнасці. Але дзе там! Дзяўчына была строгай, мела востры

язык. Карацей, за словам у кішэню не лезла. І дарэмна жаніхі, быццам пчаліны вулей, гудзелі ля брамы вясковай нявесты...

Танька рэдка калі выходзіла ўдзень на вуліцу пагаманіць з сяброўкамі – хатнія справы не адпускалі. Затое ўвечары, хараша прыбраўшыся, яна тэпала з суседкамі на танцы.

За дзеўкай болей за ўсіх увіваўся ладны хлопец з суседняй вёскі. Здаецца, Таццяна таксама адказвала ўвагай. Таму пераростаўскія жаніхі не трацілі надзеі. Спадзяваліся. І надзеі апраўдаліся: заляцанні Аляксея закончыліся заручынамі, а потым – вяселлем.

Маці, ладкуючы клункі на сані, у каторы раз давала парады дачцэ:

– Ты ж глядзі, каб абразок Божай Маці не пашкодзіўся ў дарозе, не выпаў з тваіх рук. Бо старыя людзі кажуць, што гэта – дрэнная прыкмета...

Усю дарогу да чужой вёскі Таццяна імкнулася зберагчы абразок, туліла да сябе, як малое дзіцятка. Ды праўду

кажуць: свой лёс і канём не аб'едзеш! Калі імклівыя коні панеслі сані пад гару, тыя нечакана патрапілі ў выбоіну...

На шкле ўмомант з'явілася вялікая трэшчына. Прыгадаўшы матуліны словы, Танька горка заплакала, нібыта прадчуваючы далёкую бяду. Аляксей, абняўшы нявесту, ласкава супакоіў:

– Мілая, не думай дрэннае, а спадзявайся на лепшае. Бо мы з табою будзем шчаслівыя. Людзі нам яшчэ пазайздросцяць!

Сямейнае шчасце ў маладых атрымалася з вераб'іную дзюбу. Улетку грымнула вайна, і Алёша пайшоў на фронт. Праз некалькі месяцаў Тацццяна нарадзіла сынка – першынца, якога назвалі ў гонар дзядоў – Васілём. Хуценька паведаміла мужу радасную навіну. Шкада, але палашчыць свайго сынка яму так і не давялося. Бо загінуў...

## ЯЎХІМ І З ВАДЫ ВЫЛЕЗЕ СУХІМ...

– Калі ты тое проса патаўчэш! – злуецца Макрына на свайго Яўхіма. – Вунь Мітрафан ужо пашыў новыя буркі,

ды даўно забыўся пра гэтую справу. А ты, як нейкі зломак, ніяк ні сходзіш у нашае гумно.

Яўхім толькі маўчыць, бо праўда на баку жонкі. Увечары, як выпаўзе на прызбу да мужчын, дык там і прагуляе ў падкіднога дурня. А ў вёсцы клопатаў цэлы мех, асабліва ўлетку. Макрына ж не ў стане сама перарабіць усю работу – мужчынскую і жаночую. Кінуўшы позірк на сваю маладзіцу, нечакана падумаў: “Яшчэ ж ладная баба! Чаму б ёй не падміргнуць вокам суседу Адаму. Сам бачыў, як ён азіраецца на яе ўслед, ды аблізваецца, нібы кот на сала”...

Узяў і параіў сваёй жонцы: маўляў, так вось і зрабі! І спатканне прызначай! А я тым часам пад ложак залезу. Калі ж пачне да цябе прыставаць, ды абдымаць, вылезу. Дам добрага кухталя. Потым застаўлю проса таўчы. Няхай выбірае тады: альбо дурная пагалоска па вёсцы, жончын віск на ўсю хату, альбо ўсё шыта-крыта...

Так і зрабіла Макрына. А што ёй заставалася рабіць? Калі Яўхім, як гаворыцца, ні ў біла, ні ў мяла.

...Калі Яўхім выскачыў з-пад ложка, сусед няйначай кол пракаўтнуў. "Раганосец" для прыліку шчоўкнуў Адама пад нос, схапіў за кашулю, зашыпеў, як змяя:

– Вось што, братка, калі не патаўчэш мяшок проса, дык тады крыўдуй на сябе...

...Адаму нічога не заставалася, як павінавацца, ды патупаць следам за раўнівым мужам. Да самай раніцы грукаў таўкачом у ступе няўдачлівы "жаніх", давёў справу да канца. Калі Макрына адчыніла дзверы суседу, каб той выйшаў на двор, стомлены работнік падумаў пра сябе: "Гэтыя парогі не на мае ногі!" А маладзіца, бразнуўшы клямкай, толькі зарагатала. Бо яе Яўхім і з вады вылезе сухім!...

## ЗНАХОДЛІВЫ СУСЕД

Убачыўшы суседа Януся каля ліфта на мыліцах, цётка Мар'яна залямантавала на ўвесь пад'езд:

– А Божачка! Дзе ж ты зламаў нагу? Учора ўсё было добра, а сёння...

Той, хітра ўсміхнуўшыся, тлумачыць:

– Так нарэзаўся ў сяброўкі ў гасцях,

ледзь ногі трымаюць. Каб не трапіць у медвыцвярэзнік, дыбаю дахаты на мыліцах. Сябар збегаў да свайго суседа, пазычыў.

Заўтра яму аддам...

Трэба быць знаходлівым у любой сітуацыі!

## СЛЁЗЫ

Неяк вяртаючыся з працы, прысела на вольнае месца ў тралейбусе. Паглыбляюся ў вірлівыя думкі, успамінаючы нейкія дробязныя дэталі пражытага дня. Раптам мой погляд упаў на юнака, які сядзеў недалёка. Ён быў апрануты не па сезону: у старэнькай куртцы, на нагах – стаптаныя боты. І гэта ў такую спякоту? Прыгожы твар, блінцом прыціснуты да акна, на вуснах блукала ўсмешка радасці, а на доўгіх вейках – зіхацелі кропелькі слёз. Хлопец не саромеўся іх, не звяртаў увагі на цікаўных пасажыраў. Дзесьці каля прыпынку "Ваенкамат", незнаёмец літаральна ўпіўся вачыма ў гарадскі пейзаж за вокнамі. Вусны нервова заскакалі, затрэсліліся худзенькія плечы... Дзіўны

пасажыр, глуха застагнаўшы, закрыўся рукамі, праз якія пырснулі слёзы.

Кінуўшы позірк на хлапечыя пальцы, бачу яркія аўтографы адметнай установы. Адразу ўсё зразумела. Толькі падумалася тады: “Усё ў цябе, хлопча, наперадзе! Галоўнае, што ты зразумеў свае памылкі, шмат перажыў. Значыць, не ўсё яшчэ страчана. Зазірне сонца і ў тваё аконца...”

## ШТО Ў РАЦЭ, ЯШЧЭ НЕ Ў РУЦЭ...

Мікола збіраецца ў Дом адпачынку. Вядома ж, адзін. Без жонкі. Які дурань цягае за сабой сямейную торбу?! Хопіць, што ў асабістай кватэры хапае віску. Мужчына вельмі задаволены. Быццам крылы выраслі за плячыма. Таму адразу збегаў у цырульню, потым адпрасаваў святочны касцюм, кашулю, наваксіў абутак.

Жонка, гледзячы на мужа, толькі дзівіцца. І было ад чаго! У звычайныя дзянькі Мікола няголены, у дзіравым трыко “загарае” на канапе з газетай у руках. А тут, зусім не пазнаць мужыка. З чаго б такая прыемная перамена?!

Не інакш, плануе добра павесяліцца ля Чорнага мора. Ды, пэўна, мяркуе пабегаць за якойсьці жаночай спадніцай...

А Мікола тым часам насвіствае нейкую мелодыю, старанна пакуе дарожны чамадан. Нечакана прыкмячае: не хапае важнай дэталі ў мужчынскім гардэробе – трусоў-плавак. Без іх, шчыра кажучы, ля мора, нібы тая рыба без вады. Таму гукае Люсю, каб яна прыдбала ў краме гэтую рэч.

Праз некаторы час з'явілася жонка з невялічкім пакункам у руках, які адразу паклала ў чамадан.

– Вось табе, Міколка, трусы 46-га памеру. Акурат будуць пасаваць пад тваe блакітныя вочы, – зазначыла Люся, і хітрая ўсмешка прабегла па яе вуснах. – Спадзяюся, табе яны спадабаюцца...

...У Доме адпачынку Мікола жончын падарунак пакуль не адкрываў, бо не было належнага моманту. Але надзею не траціў. І адчуваў сябе халасцяком па натуры, ды не па пашпарту... На ілбе ж не напісана, што ён жанаты чалавек, з трыма дзецьмі ўпрыдачу. Трэба дзейнічаць, шукаць жаданы аб'ект увагі...

Мары валацугі хутка збыліся. Неяк ў сталоўцы ён убачыў шыкоўную бландзінку. Мікола, быццам юла, завярцеўся каля маладзіцы, "заспяваў" на ўсе лады, імкнуўся надаць грубаватаму голасу больш прыемны тэмбр. Дый пры любой магчымасці стараўся прадэманстраваць свой багаты лексікон, спартыўную фігуру. Бо выдатна ведаў, што жанчынам хлюпікі не падабаюцца.

Відавочна, бландзінка зацікавілася новым кавалерам. Таму вырашыла запрасіць Міколу ў кіно і на пляж... Той адразу згадзіўся. Радасць распірала грудзі! Падскокваючы, як певень, паляцеў у пакой, каб пералічыць свае купюры. Зазірнуў у патаемную кішэню, а там... дуля з макам. Жонка-скнара выцягнула заначку, пакінула грошы толькі на запалкі, ды на зваротны білет. Цяпер усе прапала! Бо без грошай не разлічвай на ўвагу красуні. Палез за пакункам, які ляжаў на дне чамадана. Разгарнуў і аслупянеў! Падалося, што ў руках трымае вялізную спадніцу. Глянуў на памер, дык нават самлеў: 60-ты. І дзе толькі такі набегала?...

Адклаўшы ў бок трусы, Мікола, як воўк, завыў ад злосці. Нечакана ўспомніў з'едлівую ўсмешку Люсі і ўсё зразумеў...

## УСПАМІН

Што ні кажыце, а сустрэча з мудрым чалавекам, быццам нейкі падарунак лёсу. Бо, як кажуць, прыгажосць прыглядзіцца, а розум прыгадзіцца.

Неяк увечары, вяртаючыся з працы, прысела на лаўку каля цёткі Марылі. Павітаўшыся, жанчына кіўнула ў бок пад'езда, дзе таўкліся шумлівыя падлеткі.

— Во якая зараз моладзь! – сумна зазначыла пажылая кабета. – Дзяўчаты, якім самім Богам наканавана быць увасабленнем душэўнай раўнавагі, будаваць мост паміж мінулым і будучым, працягваць існаванне роду чалавечага, — цяпер зусім здурнелі. І ад чаго гэтак адбылося, га? Смаляць цыгарэты, жлукцяць, як з цэбра, гарэлку, мацюкаюцца, распусьнічаюць... А вось маё пакаленне расло іншым. Таму, мусіць, і перамаглі ворага ды паднялі з руін гарады і вёскі...

Тут цётка ўздыхнула, выцерла вочы

хусцінкай, пачала свой няхітры аповед пра жыццё-быццё. Замілаваная роднай гаворкай, я не заўважыла, як вечар апусціў на зямлю шэрыя крылы, як дзесьці ў далёкіх нябёсах успыхнулі першыя зоркі.

...У той дзень Марыйка была вельмі вясёлай – спявала, бы той салоўка. За што б ні ўзяліся ўмелыя рукі – адразу даводзіла да фінішу любую справу. За працай успомніла сваіх аднагодкаў, з якімі ў дзяцінстве гойсалі па вясковых вуліцах, купаліся ў вузенькай рачулцы, збіралі шчаўё. Нягледзячы на ваеннае становішча, маладосць бярэ сваё. Таму ўвечары падлеткі збіраліся разам, гаманілі пра тое-сёе, калі-нікалі спявалі ды танцавалі пад гармонік.

Вось і сёння планавалі наладзіць вечарыну дзесьці на Усеслі, каб пажартаваць, даведацца пра справы на фронце. Але раптам дзяўчо заўважыла, што праз акенца на яе пазірае чужынец, з металічным крыжам на чорнай гімнасцёрцы. Відавочна, увагу ворага прыцягнула доўгая дзявочая каса, прыгожы тварык.

Пакуль Марыйка разважала, што

рабіць далей, гітлеравец адчыніў брамку і пашыбаваў да ганка. Дзяўчына змікіціла: нічога добрага гэтая сустрэча не абяцае! Яна кінулася да акна, з усёй сілы ірванула на сябе раму і выскачыла на вуліцу. Марыйка  хутка прабегла некалькі хат, заляцела ў двор цёткі Вулькі – адзінокай жанчыны, спагадлівай і разважлівай.

З парога закрычала:

– Цётка, ратуй!

Цётка адчыніла склеп, які знаходзіўся пад падлогай, строга папярэдзіла:

– Сядзі тут, бы мыш пад венікам! Не чыхні, не кашляні. Інакш – капут будзе нам.

Марыйка скокнула ў цемень, а цётка, закрыўшы ўваход, прысела на табурэт, занялася рамонтам адзення. Сама арудавала іголкай ды “страляла” вачыма па вокнах. Дзе ж той ліхадзей, што так напалохаў дзеўку?

А ён якраз тупае ля хаты, азіраецца па баках. У Вулькі аж сэрца ёкнула. Фашыст, угледзеўшы кабету, пытаецаа праз адчыненае акно:

– Мутар, дзе паненка? Ці не бачылі, куды яна пабегла?

Заціснуўшы хваляванне, цётка дыбае бліжэй і ківае ў бок хутара: маўляў, туды бегла бялявая дзяўчына, шукай там...

Чужынец кіруе на хутар, а цётка, адчыніўшы склеп, ціха гукае:

– Ці жывая ты там, дзеўка? Вылазь, ды агародамі дабірайся да сваёй хаты. Ужо цёмна, ніхто не ўбача цябе. Ды глядзі, апранайся, як бабулька, патынкуй тварык сажай. Трэба ж неяк ратавацца ад злога вока...

... З той пары Марыйку было не пазнаць – кудлатая, брудная, заўсёды ў лахманах. А калі тэпала да калодзежа па вадзіцу, дык яшчэ і кульгала... Сяброўкі, вядома ж, спачатку рагаталі, а потым сталі рабіць гэткі ж "макіяж", залазіць у дзіравую вопратку.

Менавіта такая хітрасць дапамагала многім дзяўчатам выжыць у часы фашысцкай акупацыі. А пасля вайны – выйсці замуж, нарадзіць дзетак...

## СПАДЧЫНА

Кажуць, радня да паўдня, а як сонейка зойдзе, дык і д'ябал не знойдзе. Вельмі

трапны выраз, які дапамагае зірнуць на жыццёвыя абставіны іншымі вачыма.

...У сям'і Ліпкіных было шасцёра дзяцей. І ўсё сыны. Рослыя, дужыя, шыракаплечыя. Бывала, зірне цётка Агата на сваіх хлапцоў, ганарліва ўсміхнецца. Бо не ў кожнай хаце сустрэнеш столькі мужчын. Ды не абы – якіх! А ўмелых, працавітых. І вясёлых, прыгожых. Хоць дзяцінства было цяжкім, затое цяпер лягчэй. Вунь Лёшка з Янам за словам у кішэню не лезуць. А як возьмуцца касіць траву ў лузе, дык вачэй на адарваць!

Не горшыя і Піліпка з Аляксандрам – сапраўдныя майстры! Любая справа ім па плячы. Дый Пятрусь з Архіпам сыны што трэба. Заўсёды дапамогуць па гаспадарцы, не горш за дзевак навядуць чысціню ў хаце і на панадворку. Адзінае шкада, што не ўбачыць болей сваіх сыноў Яўхім – загінуў на вайне.

Непрыкметна падраслі сыны, як птушаняты пакідалі роднае гняздо. І засталася ў хаце адна цётка Агата – пастарэўшая, хворая. Салдацкай ўдаве давялося шмат паспытаць салёных слёз, пакуль не вывела ў людзі сваіх хлопцаў...

Сыны, зразумела, матулю не забывалі, дапамагалі рабіць тое-сёе. Напрыклад, Піліпка з Аляксандрам жылі далёка, у Смаленску. Але наведваліся ў вёску два-тры разы ў год, не забывалі.

Ясным сонейкам сталі малодшыя, якія рабілі ў Гомелі. Яны зазіралі ў родныя мясціны даволі рэгулярна, пакавалі ладныя торбы з вясковымі дэлікатэсамі. Ну, а калі прыдбалі аўтамабілі, дык, лічы, з хаты не вылазілі.

Але асноўным памочнікам быў Архіп. Вярнуўшыся з войска, ён мігам ажаніўся на мясцовай прыгажуні. Тамара, як кажуць, скруціла тады салдата ў абаранак. І не памылілася – не выпівака, не гуляка. Праўда, спачатку таксама спрабаваў растапырыць крылы на горад, але жонка адгаварыла:

– Куды паедзем, мілы? У нас жа ў горадзе нічога няма. Ні кала, ні двара... А тут побач родныя людзі. Праз год пабудуем хату, засеем агарод...

Архіп, ўзважыўшы словы сваёй маладзіцы, скеміў. Як гаворыцца, на адным месцы і камень мохам абрастае. Так і чалавек.

Міналі гады, прыносілі перамены. Так ужо атрымалася, што Піліп і Аляксандр загінулі – адзін на будоўлі, другі – у аварыі на дарозе. А вось Алёша з Янам літаральна згарэлі ад нейкай брыдоты ў шклянцы. Неяк "замачылі" браты свае дачы. Ды так,  што апынуліся на тым свеце...

Матуля адразу пачарнела, бы тая яблынька, засохла з гора. Пахавалі Агату на вясковых могілках і забылі. Быццам, не жыла на свеце жанчына, не працавала ў калгасе.

Сыны – Пятро і Архіп – доўга не маркоціліся. Пэўна, братоў хвалявала толькі адно пытанне – бацькоўская хата, якая, між іншым, выглядала яшчэ даволі прыстойна.

Аднойчы Пятро прапанаваў брату ідэю: маўляў, давай зробім па-свойску. Хата мае два пакоі. Няхай мне дастанецца маленькі, табе – больш прасторны. Паставім перагародку, другія ўваходыя дзверы, сенцы... Дый агарод падзелім. Хоць і дачу маю, але ж што назбіраеш з тых пяці сотак! І дзяцей з унукамі трэба карміць. Зараз жа час нялёгкі...

Архіп згодна заківаў галавою. Але дома было іншае: маўляў, твой браток зарабляе вялікія грошы, лічыцца багаццем. Няхай купіць хату цёткі Марфы, якая нядаўна памерла. І агарод там вялікі, сотак 25—30 набярэцца!

Назаўтра, адвёўшы ў бок вочы, Архіп прамямліў:

– Ведаеш, браток, пачакай рабіць другія дзверы. Вунь дождж пайшоў, толькі макрэчу пусцім у хату.

Калі Пятро паехаў у Гомель, Архіп замяніў замкі на дзвярах, нават на браме. Вядома ж, было крыху сорамна за свае ўчынкі. Усё-такі Пятрусь, родная кроў. Прытым – адзіны брат...

Калі гамяльчанін завітаў у вёску, адразу паехаў да свайго двара. Тузануў клямкі роднай хаты адзін раз, другі... Не адчыняліся дзверы! Здзіўлены, зразумеў, што брат паставіў унутраны замок. І не абы-які, а з засакрэчаным механізмам.

Пятрусь азірнуўся і заўважыў на агародзе знаёмую постаць. З прытоеным хваляваннем падыбаў у той бок

...Потым вяскоўцы толькі дзівіліся. Бо

браты Ліпкіны пабіліся, як тыя пеўні. Вось як бывае на свеце! Родныя людзі становяцца ворагамі. І толькі таму, што не змогуць мірна падзяліць спадчыну...

## ТРЭБА НЕСЦІ СВОЙ КРЫЖ ЦЯРПЛІВА

Неяк, вярнуўшыся з работы, Марылю ахапіў адчай. Мужа, як звычайна, не было дома. Пэўна, дзесьці швэндаўся па піўнушках, ці бавіў час у якойсьці чарговай маладзіцы. Дзеці таксама разбегліся хто куды...

Успомніўшы прыкрыя малюнкі сямейнага жыцця, яна галасна заплакала. "І калі Арцём паразумнее? – падумала журботна. – Ужо пяты дзесятак ляціць. А ён, нібыта той шмель, бесклапотна пырхае з адной кветкі на другую"...

У чарговы раз думкі тачылі галаву, дарылі ўспаміны. Зноў убачыла сябе маладою ды прыгожаю. Што тут казаць! Заляцаліся да Марылі хлопцы. І не адзін. А вось, як на тое гора, выбрала сабе такога спадарожніца жыцця. Цяпер толькі плача ды скуголіць у падушку.

Амаль усе дзеці Марылі знайшлі свае

палавінкі, жывуць добра. Засталіся ў хаце толькі Волька ды Міцька. Школьнікі старэйшых класаў. Здавалася, жыві і радуйся. Ды не! Як на тое, збіўся з панталыку муж, пачаў бегаць за жаночымі спадніцамі. Быццам здурнеў. Сорамна перад людзьмі. Што ні рабіла – нічога не дапамагае. Хадзіла нават да варажэйкі. Тая, кінуўшы карты на бубновага караля, зазначыла: "У ягонай галаве – чарнявая жанчына, якая мае сваю хату. Вельмі хітрая асоба. Глядзі, каб не збег да яе!

Марыля тады амаль крыкнула: маўляў, няхай бяжыць! Хоць вочы не будзе мазоліць гэтая нахабная морда... А дома галасіла, бы штосьці згубіла. Чаму так атрымалася? Думалі ж будаваць сямейны карабель так, каб ён не сеў ніколі на мель.

Патупаўшы па хаце, Марыля выйшла на двор. Адчыніла браму, пасунулася ў бок ракі, мяркуючы кінуцца ўніз галавою. Але да ракі жанчына не дайшла. На сцежцы ўбачыла чалавека з кіёчкам, які таптаўся на адным месцы. Адчуўшы побач Марылю, стары папрасіў:

– Маладзічка, дапамажы мне, калі

ласка, дабрацца да хаты. Штосьці сёння я дрэнна арыентуюся... Пэўна, сонейка вінавата, бо дыхаць цяжка.

Марыля, падхапіўшы сляпога пад локаць, павяла яго да вёскі. Па дарозе даведалася шмат чаго цікавага, бо чалавек быў гаваркім і мудрым. Ужо каля ягонай хаты, ён, павярнуўшы невідушчыя вочы кудысьці ўбок, ціха сказаў:

– Не ўздумай ніколі рабіць тое, што сёння задумала. У цябе ж яшчэ двое дзетак, якіх трэба падняць на ногі, вывесці ў людзі. Грэх вялікі накласці рукі на сябе, закончыць жыццё самагубствам...

Марыля здрыганулася. Адкуль даведаўся стары пра гэта? Стала не па сябе. Пакланіўшыся да зямлі чалавеку, у думках падзякавала за добрыя словы і выратаванне. Падумалася: "Трэба несці свой крыж прыстойна, быць цярплівай. У мяне ж ёсць сонейка ў вокнах – дзеткі, працяг майго жыцця"...

## СУСТРЭЧА

Толькі дарогі дораць нам неспадзяваныя сустрэчы, якія запамінаюцца надоўга.

...Напярэдадні Радаўніцы зазірнула ў жлобінскія мясціны – там пахаваны мой брат, які трагічна загінуў у 46 гадоў. Наплакаўшыся ўволю, навяла парадак каля магілкі, завязала ручнічок на крыж. Доўга затрымлівацца не змагла: трэба было спяшацца на цягнік.

Мне пашанцавала: у вагоне знайшлося вольнае месца. Дый спадарожніца папалася вясёлая, гаваркая. Праз некаторы час горыч і боль прытупіліся, а слёзы – забыліся...

Таццяна Паўлаўна – так клікалі маю новую знаёмую – ехала ў Гомель да сына, які знаходзіўся ў бальніцы.

– Я сама родам з Міншчыны, - распавядала жанчына. – Але лёс распарадзіўся так, што давялося жыць у Гомелі. На заводзе пускавых рухавікоў занатавала доўгую працоўную сцяжыну – у цэлых 45 гадоў!

Потым Таццяна Паўлаўна ахвотна расказала пра сваіх дарослых дзяцей, пашкадавала хворага сына. Два гады таму нечакана памёр яе муж. Таццяна Паўлаўна вельмі сумавала. Бо два сыны і дачка

жылі асобна, мелі свае кватэры і сем'і. Застацца адной, як ні кажыце, не вельмі прыемная справа...

Неяк старшыня прафкама, угледзеўшы сваю работніцу, паспачувала ды прапанавала адпачыць ў мясцовых Чонках. Таццяна Паўлаўна дала згоду. Меркавала так: новы асяродак дапаможа "палячыць" самоту, затушуе ўспаміны, якія точаць, нібыта іржа жалеза.

І сапраўды: на новым месцы ўсе падалося іншым. Відавочна, не дарэмна кажуць: час – добры лекар... Таццяна Паўлаўна пазнаёмілася з маладой жанчынай Люсяй, пасябравала. Нягледзячы на розніцу ва ўзросце, яны заўсёды былі разам – на лячэбных працэдурах, у сталоўцы, на прагулках. Неяк Люся прапанавала старэйшай сяброўцы зазірнуць увечары на танцы. І як у ваду глядзела! Менавіта гэтая вандроўка вызначыла далейшы лёс Таццяны Паўлаўны. Бо там яе прыкмеціў адзін паважаны чалавек.

Як потым высветлілася, Іван Нікіфаравіч лічыўся ўдаўцом, за плячыма меў ўжо 72 гады жыцця. Таму пажылы інтэ-

лігент не спяшаўся да чарнявай прыгажуні з сардэчнымі прапановамі, а назіраў за "аб'ектам" сваёй увагі здалёк. Але, калі даведаўся пра тое, што маладзіца размяняла сёмы дзесятак, нечакана набраўся смеласці ды пазнаёміўся.

Потым была пяшчотная перапіска. Лісты ў Гомель ляцелі, бы птушачкі, радавалі клопатам, улюбёнасцю. Таццяна Паўлаўна да прапановы зазірнуць у ЗАГС аднеслася з хваляваннем. Адразу вырашыла параіцца з дзецьмі. Тыя ўспрынялі навіну спакойна, без розных там эмоцый. Толькі крыху пажартавалі ды параілі пабрацца законным шлюбам. Напаследак сказалі: маўляў, ты, матуля, на нас не глядзі, яшчэ ж сама на старая! Уладкоўвай асабістае жыццё, не выпускай сваю птушку шчасця. Няхай жаніх і старэйшы на дванаццаць гадоў, але, як мовіцца: стары конь баразну не псуе...

Вось так і стала Таццяна Паўлаўна гаспадыняй прыватнага дома ў Жлобіне. І не шкадуе. Як гаворыцца па-руску: "Любви все возрасты покорны!.."

## АХВЯРА БАХУСА

Быў цудоўны асенні вечар. Асобным гараджанам, верагодна, не сядзелася ў кватэрах. Таму, выбраўшыся на свежае паветра, яны чародкамі тупалі па бруку – гаманілі, смяяліся. Сярод квяцістага натоўпу прыкмеціла шэрую постаць, якая мітусліва шукала кропку апоры. Але чамусьці не знаходзіла, хісталася туды-сюды, падала вобземлю. Тады торбы мужчыны, нібыта птушкі, разляталіся ў розныя бакі. Стаўшы на хісткія ногі, з цяжкасцю сабраўшы свае клункі, чалавек зноў ірваўся наперад, да сваёй хаты. Ды вось бяда! Ногі пасля шматлікіх чарак не жадалі слухацца свайго гаспадара, коўзаліся, як на лёдзе...

У чарговы раз, "пацалаваўшы" брук, недарэка заціх, пачаў набірацца новых сіл. Цікаўны люд адразу адрэагаваў на нерухомую фігуру. Некалькі хлопцаў і жанчын прыпыніліся каля мужчыны, штосьці яго пыталі. Нарэшце падлеткі, падхапіўшы дзядзьку разам з торбамі пад рукі, павялі яго дахаты.

## АТРЫМАЛІ ЗАРОБАК

Два дзябёлыя мужчыны таўкуцца каля гарэлачнага аддзела, старанна лічаць пакамечаныя паперкі-грошы. Набраўшы патрэбную суму, купляюць бутэльку віна. Прадаўшчыца ўшчувае:

– Можа, хлопцы, ужо хопіць! У трэці раз купляеце гэтую атруту. Лепей купіце цукерак дзеткам ды нясіце заробак сваім жонкам!

## ЖНІВЕНЬ – ВЕСНІК ВОСЕНІ

Жнівень нясмела пакрочыў па зямлі, патроху фарбуючы дрэвы і кустоўе ў жоўты колер. Па-гаспадарску кінуў вокам на дары лясоў і садоў, каб упэўніцца, што зазірнуў сюды своечасова.

Дзе-нідзе віднеліся грыбы, чарнела каліна. А рабіна, бы тая дзяўчына на вяселлі, залівалася чырванню. Гэты своеасаблівы касцёр хваляваў сэрца, застаўляў азірнуцца навокал. А ў садочках даспявалі яблыкі, ігрушы – тугія, духмяныя. Густы водар садавіны казытаў нос, разлятаўся па ўсяму наваколлю.

А вось калгасныя нівы, вясковыя агароды сталі амаль пустымі. Бо клапатлівыя гаспадары добра пашчыравалі тут, шмат чаго назапасілі да зімы. Засталіся толькі нейкія штрыхі, каб давесці да ладу зямлю. Усе тое, што было кінута рупліваю рукою ў раллю, прарасло дый парадавала неблагім ураджаем. Бо трэба ж спяшацца, не спаць у шапку. Увосень – знікае просінь. А дзянёчкі становяцца карацейшымі і халаднейшымі.

Надвячоркам сівы туман вужакай выпаўзае з лагчыны, мяккай посцілкай сцелецца па лузе, нябачных сцяжынах. Туман – першы веснік восені, які вынішчае кветкі, зялёную лістоту. Адчуўшы асенні подых, адляцелі ў вырай стрыжы і ластаўкі. У далёкую дарогу рыхтуюцца многія птушкі, збіраюцца сем'ямі, гартуючы крылы.

Жнівеньская цішыня ў лузе і ў лесе рэжа вушы, нараджае маркоту. Міжволі думаецца аб існасці чалавечага жыцця, дзе так шмат незразумелага і цікавага. І выходзіць – на свеце няма нічога вечнага, усё тут часовае...

## НЕ ЧАКАЙ ПАДЗЯКІ АД ПРЫБЛУДНАГА САБАКІ...

– Чаму гэта да цябе муж не прыязджае ў бальніцу? – дзівяцца суседкі па палаце. – Ці ён ў цябе шастае па камандзіроўках?

Крыху памаўчаўшы, Агрыпіна неахвотна адказвае: маўляў, родненькі ўсё шчыруе на дачы, поўзае па градах... Хоць сама добра ведала, дзе старанна "шчыруе" яе Анціп... Пэўна, зноў прытуліўся да нейкай маладзіцы, дый зубы "сушыць". І навошта толькі выходзіла за яго замуж?

Перавярнуўшы ў памяці некалькі старонак маладосці, кабета зноўку замаркоцілася. І было ад чаго! А што, скажыце, трэба рабіць, калі Адась перастаў дасылаць лісты з арміі? Відаць, ягоная маці пастаралася ўкласці ў вушы свайго сыночка навіну. І не адну... Верагодна, таксама пісала, што Агрыпіна з кавалерам катаецца на аўтамабілі. Паверыў хлопец. Як тут не давяраць родненькай матулі! Таму, як кажуць, ні слыху, ні дыху...

І сапраўды: каталася. І не адзін раз.

Ды толькі разам з братам Міхасём. У той час Анціп працаваў з ім у адной арганізацыі. Таму ўранні Анціп гучна сігналіў каля двара, потым усе ехалі на працу. Агрыпіна рабіла тады фельчарам у вясковым акушэрска-фельчарскім пункце.

Неяк Міхась захварэў, прастудзіўся. Таму Агрыпіна паехала адна з Анціпам. Як звычайна, машына пакацілася па вясковай вуліцы, пераляцела цераз драўляны масток... А што было далей, дзеўка не помніць. Зусім. Толькі адчула тады страшэнны ўдар збоку, машына ўздрыгнула, перакулілася.

... Адкрыла вочы на бальнічным ложку. Павярнула галаву – побач матуля. Змарнелая такая, пад вачыма сінякі. Убачыўшы, што дачка прыйшла ў сябе, радасна ўсміхнулася. Нават заплакала. Але хуценька супакоілася.

– Цяперака жыць будзеш доўга! – сказала так і прытулілася да Агрыпіны. – Анціп ужо некалькі разоў забягаў. Хлопец шчаслівы: ні адной драпінкі! У кашулі нарадзіўся.

Потым дзяўчына даведалася, што

Анціпа зацягалі ў міліцыю. Бо, як ні круці, а вінаваты. Аварыя здарылася не сама па сябе. Кажуць, каб мінаваць турму, хлопцу прапанавалі ажаніцца... на пацярпелай. І праўда. Хто ж возьме такую пакалечаную замуж?

Праз некаторы час наведаўся Анціп. Патупаў ля парога, сарамліва зірнуў у вочы дзяўчыны. Прынёс цукеркі, кветкі. Напэўна, жадаў загладзіць сваю віну. Потым зазірнуў у бальніцу яшчэ некалькі разоў. Гаварыў пра жаніцьбу, стараўся дагадзіць...

Агрыпіна напісала ліст жаніху: маўляў, што мне цяпер рабіць? Ад былой красы застаўся толькі ўспамін. Душа не горнецца да Анціпа, кахаю толькі цябе... Адказу не дачакалася. Напісала яшчэ адзін ліст. Але дарэмна.

Анціп жа, бы смала, прывязаўся да Агрыпіны. Абяцанак нагаманіў цэлы мех і кайстру. Бо наперадзе чакала турма! Дык і жабу, як кажуць, жонкаю назавеш. Праз месяц-другі дзяўчына папраўілася. Зніклі рубцы і сінякі пад вачыма. Неяк яна пасвяжэла, вярнулася вабнасць і рухавасць.

Калі выпісвалася з бальніцы, Анціп глядзеў на яе амаль улюбёна. Потым распісаліся, згулялі вяселле. Спачатку жылі добра. Кахання, зразумела, вялікага не было. Але ядналі іх сумесная кватэра, дзеці...

Як гаворыцца, не чакай падзякі ад прыблуднага сабакі! Неяк жанчына заўважыла, што муж стаў затрымлівацца на рабоце. Спачатку меркавала, што затрымліваюць Анціпа грамадскія справы. Вырашыла праверыць. Толькі тады зразумела, як памылілася...

Аднойчы прыбралася як след, ды падыбала ў той бок, дзе жыла краля Анціпа. Паглядзела, крыху пасумавала. Вядома ж, за 18 гадоў, якія пражылі разам, кабета папаўнела, страціла юнацкі воблік. І аварыя, калі казаць шчыра, адабрала здароўе. Таму стала частым госцем у бальніцах. А муж, як мовяць, любіць жонку здаровую...

Спрабавала ўшчуваць Анціпа, прысароміць: маўляў, дачка ўжо нявеста, а цябе пацягнула невядома куды... Але дзе там! Нічога не бярэ! Быццам не пра яго ідзе гамонка. Стаў нават па два-тры дні не

прыходзіць дадому. Аднойчы, калі не было дзяцей у хаце, кабета набралася смеласці ды выказала патаемнае:

– Чаго ты бегаеш туды-сюды! Пераходзь да сваёй каханкі, ды жыві, як у Бога за пазухай. Не прыніжай мяне і сваіх дзяцей!

Муж пабялеў, бы палатно, злосна крыкнуў:

– Са сваёй кватэры я нікуды не пайду! Як мне падабаецца, так і буду жыць. Сама павінна здагадацца, чаму я на табе ажаніўся...

Агрыпіна перастала заўважаць выхадкі мужа. Разумела: старое не вернеш, а жыць трэба далей. Вось так і існуюць яны пад адным дахам. На першы погляд — шчаслівая сям'я. А калі разабрацца бліжэй, дык становіцца не па сабе. А што цяпер рабіць? З мора вады не выпіць, з песні слова не выкінуць...

## ХІТРАСЦЬ – НАДЗЕЙНАЯ ЗБРОЯ

Танька Пенкіна была невысокай, але прыгожанькай. Бывала, як засмяецца – быццам срэбраны званочак зальецца. Дый

бялявыя кучаравыя косы прыцягвалі хлапечыя погляды. Асабліва гэта адчувалася, калі дзяўчына выбівала "марзянку" сваімі абцасікамі.

Танька мела шмат жаніхоў. Але перавагу аддавала толькі двум – Феліксу і Віктару. Хлопцы нават не здагадваліся аб гэтай дзявочай хітрасці, бо не ведалі адзін аднаго. Пэўна, нявеста больш прыхільна ставілася да Фелікса – рослага, бялявага і таксама кучаравага. А вось Віктар не выйшаў ростам... Ды затое быў выхаваным, вабным, адукаваным, не курыў і не піў гарэлку. Многія дзяўчаты з маладзёжнага інтэрната літаральна "сохлі" па ім, а ён нават не заўважаў іх.

Аднойчы Танька вырашыла праверыць пачуцці сваіх жаніхоў. Бо ніяк не магла выбраць правільную арыентацыю ў такім важным пытанні, як замужжа. Абодва хлопцы ёй падабаліся. І, відаць, развітацца з кімсьці яна не вельмі жадала. Таму доўга не кумекала, а прыкінулася хворай. Пры гэтым строга папярэдзіла сяброўак па інтэрнацкім пакоі, каб маўчалі, нічога не казалі.

І адбылося вось што. Калі Фелікс пераступіў цыбатымі нагамі знаёмы парог, то ўбачыў такі малюнак: Таня зашылася пад коўдру, а на галаве – мокры ручнік. Дзяўчына вохкала, раз-пораз прыкладваючы да вачэй насоўку.

Хлопец патаптаўся на адным месцы, зыркнуў на дзяўчат ды кажа:

– Дык я пайшоў! Калі будзеш здаровай, то сходзім у парк, пакатаемся на цеплаходзе...

І падыбаў па вузкаму калідору. Але дадому не дайшоў – перахапілі знаёмыя дзяўчаты, з якімі разам працаваў на будоўлі. Забыўшыся на "хворую" нявесту, Фелікс весела правёў вечар.

Дзесьці хвілін праз трыццаць у дзверы зноў пастукалі.

– Віктар прыйшоў! – прашаптала Танька ды зноў уладкавалася на ложку.- Адчыняйце...

Хлопец, павітаўшыся, разуў бліскучыя туфлікі ў парозе, занепакоена кінуўся да "хворай".

– Што здарылася, любая? – адразу запытаў, асцярожна ўзяў дзявочую руку, пацалаваў.

Танька прасіпела ў адказ:

– Захварэла. Мусіць, зноў хапанула нгіну...

Віця заёрзаў на табурэце, бездапаможна азірнуўся на дзяўчат, прапанаваў:

– Можа, хуткую дапамогу выклікаць?

– Не трэба турбаваць медыкаў рознай дробяззю! – захваляваліся хорам сяброўкі. - Лепей схадзі ў аптэку.

Хлопец, бы спружына, ускочыў з месца і знік за дзвярыма. Праз некаторы час зноў пачуўся стук. Адчынілі. І ўбачылі Віктара з торбамі. Задаволены, ён адразу выклаў лекі на тумбачку. Потым дастаў прысмакі: сокі, цукеркі, пячэнне, каўбасы...

Убачыўшы гару дармавых падарункаў, дзяўчаты здзіўлена пераглянуліся. А ў Таніных вачах, бы той тук, адразу застыў смех. Яна з пяшчотай паглядала на хлопца, сарамліва хаваючы позіркі пад коўдру.

Праз некаторы час нявеста вызначыла дзень вяселля. Вось так і ўзялі законны шлюб Віктар і Таццяна. І жывуць цяпер ў любові ды згодзе.

## ТРАВЕНЬ

Кажуць, вясновы дзень год корміць! А майскае цяпло пасля абеда – уцякло... Хоць распускаецца лістота, зацвітаюць чаромха, бэз, розныя кветачкі і садочкі, але сонечны дзень часам прыносіць своеасаблівыя сюрпрызы. Народныя прыкметы таксама папярэджваюць: зацвіла чаромха – чакай халадоў! Хатнія птушкі хаваюць дзюбу пад цёплае крыло – таксама вяшчуюць пахаладанне. На гэты конт існуюць нават трапныя народныя прыказкі. Напрыклад, такія: “Май халодны – год урадлівы”, “У кашулях араць – у кажухах сеяць”.

Але, нягледзячы на гэткія выкрутасы надвор’я, май – сапраўднае свята для чалавека і ўсяго жывога на нашай зямельцы. Пасля халоднай зімы гаспадыні весела выганяюць на луг, на пашу сваю жывёлу. Бо пайшла ў рост зялёная траўка, значыць, малаку прыбаўка. Ажывае прырода. На свет з’яўляюцца новыя насельнікі лесу – птушаняты, ваўкі, ласяняты... Вечарамі паветра гудзе маленькімі самалёцікамі-хрушчамі – майскімі жу-

камі, водар зяляніва, кветак разносіцца на ўсё наваколле. Меладычныя гукі даносяцца ад сажалкі, азярца ці рачулкі. Такім чынам "шліфуюць" сваё вакальнае майстэрства вадзяныя жабы. Дзіўныя спевы залятаюць у адчыненыя вокны, застаўляюць слухаць начныя канцэрты гэтых істот, радавацца і сумаваць...

Ранкам дзумкаюць працаўніцы-пчолкі, збіраюць нектар з першых кветак стракатыя матылі, звініць птушыны хор. У народзе лічаць, што салавейка пачынае співаць толькі тады, калі можа напіцца расы з бярозавага лісточка. А калі ўжо заспявае, быццам на гуслях зайграе. Заслухаешся! Убачыш часам шэры трапяткі камячок сярод мяккіх галінак, толькі дзівуешся: "Адкуль столькі радасці ў цябе, салоўка? У якіх мясцінах назбіраў гэтулькі дзівосных матываў?"

Але спявае салавейка нядоўга. Ужо ў ліпені таленавіты "артыст" мусіць анулюваць сваю сольную праграму. Цяпер – не да спеваў! З'явіліся дзеці, а іх трэба добра карміць, сяму-таму навучыць, каб былі хітрэйшымі ды разумнейшымі. У траўні звонка кувае зязюлька, з'яўляюц-

ца камары, мошкі, куслівыя авадні. Квяцісты луг аж кіпіць празнымі насякомымі. Прыляціць вятрыска і прылашчыць кучаравыя чупрыны дрэў, хмызнякоў, хвалямі прабяжыць па зялёнай траве. Гулкая навальніца з маланкамі-бліскавіцамі і перуном парушае звыклае жыццё ў прыродзе.

Сыпане густы дожджык, затаньчыць па шыбах, даху, скокне на мурог і пойдзе кругаля далей у агарод, поле... Усе птушкі тады хаваюцца ў надзейнае месца, каб паціху пераседзець навальніцу. Выгляне сонейка, засмяецца з вышыні прамяністай усмешкай – ізноў пускаецца ў скокі рой матылёў, жучкоў, пчолак...

У гэтую пару года шмат клопатаў ў вяскоўчаў, дачнікаў. Прыйшоў час араць, скарадзіць, сеяць... Трэба спяшацца, каб усе справы выканаць своечасова, у самы сціслы тэрмін. Недарэмна ж кажуць: “Вясновы дзень год корміць!”

## СТЭЛА

Каб скараціць шлях дадому, крочу па вузенькай вуліцы, якая нагадвае завулак.

Азіраюся навокал, з цікавасцю кідаю погляды на так званы прыватны сектар. Лаўлю сябе на думцы, што тут таксама розны люд жыве – багаты і бедны.

Насустрач бяжыць худзенькае дзяўчо гадоў сямі-васьмі. Босыя, у цыбках ногі, сукенка даўно просіць мыла... Прыпынілася ля мяне, пытаецца:

– А дзе ваша хата? Я штосьці вас зусім не ведаю.

Усміхаюся і кажу:

– Мая хата далёка. На гэтай вуліцы я не жыву.

Малая, пацёршы нос, нечакана змяніла тэму нашай размовы:

– Дай тысячу.

Адкрываю кашэль, працягваю грошы. Яны хуценька знікаюць у кішэні. Заўважаю, як з хаты выходзіць маладая цыганка, штосьці крычыць дзяўчынцы.

– Хто гэта? – пытаюся.

– Мая маці.

– Ты таксама цыганка? – дзіўлюся, бо малая русагаловая. І зусім не падобна на чарнявую маці.

Тэпаю далей. Дзяўчо – следам. Бачу,

што ёй не хочацца развітвацца. Але ў мяне справы. Трэба спяшацца. Прыпыніліся са Стэлай каля старой брамы, дзе салодка спаў, быццам пшаніцу прадаўшы, нейкі выпівака. Тыцнуўшы пальчыкам у яго бок, дзяўчынка шчыра кажа:

– А гэта – мой татка...

Жахнуўшыся, зазіраю ў сінія вочкі, заўважаю там сум і боль. І тварык у Стэлы худзенькі, бледны, павекі прыпухлі. Ці паела яна хоць калі-небудзь удосталь? Бо акрамя яе ў сям'і яшчэ двое маленькіх дзетак.

Развітваемся. Спрабую ўсміхнуцца, але чамусьці не атрымліваецца.

– Калі ты яшчэ будзеш на нашай вуліцы? – пытаецца Стэла.

Пацiскаю плячыма. Адказаць на гэта пытанне цяжка. А яшчэ цяжэй – адчуваць дзіцячае гора...

## ЖАНІЦЬБА

– Гэй! Што ты там, як жук, корпаешся ў тым гумне, - крычаў Андрусь свайму суседу -аднагодку. – Чуў навіну? Тваю Нэльку сватаць пайшоў Міцька Дрын.

Ад такой інфармацыі Юрась умомант спалатнеў. І было ад чаго! Бо ў яго кішэнях вецер свішча, а Дрын – аўтамабіль купляць збіраўся... Ад болю забегаў па гумну, зароў, бы той вяпрук, зашчаміўшыся ў плоце.

Убачыўшы адчай сябра, Андрусь ляпнуў яго па плячу.

– Хопіць ваду ліць! Збірайся ў дарогу, паедзем у вёску да нявесты – сватацца будзем. А што? Чым ты горшы за гэтага прыдурка! І рост добры, і абліччам выйшаў. Касцюм і туфлі выдаю на пракат, потым вернеш.

...Падрулішы да двара Нэлькі, машына падала гучны сігнал. Дрынавы сваякі аж вытыркнуліся ў вокны ды разявілі зяпы. Заспяваў гармонік, залівіста зазвінеў бубен у руках чарговых сватоў. Святочная дэлегацыя смела рушыла ў хату.

Што далей было? Хто яго ведае. Зразумела толькі адно: Дрыну, пэўна, паклалі гарбуз пад нос. Бо праз пяць хвілін, як завітаў Юрась, Міцька з талакой вяскоўцаў выскачыў на ганак. Злосны

такі, чырвоны, з перакошаным набок тварам. Сябры хуценька разбегліся па сваіх хатах, а "жаніх" падыбаў у краму, каб горла прамачыць ды зняць стрэс "чарнілам"...

## ЯК ЗОСЬКА ЗАМУЖ ВЫХОДЗІЛА...

Зоська – прыгожая дзяўчына. Пра такіх пляткараць суседкі, зайздросліва пазіраюць услед. Мужыкі таксама лыпаюць вачыма, цешачы сябе марамі і надзеямі.

Але, нягледзячы на стройную фігуру і вабнасць, Зосьцы чамусьці не шанцуе на жаніхоў. Да прыкладу, два гады цярпліва чакала свайго адзінага каханага Антося з войска, штодзень пісала лісты. Прытым, нават ні на аднаго хлопца не зірнула, не ўсміхнулася на прывітанне. А як вярнуўся прыгожанькі салдацік, дык пачаў бегаць у другую браму. І было б да каго залянацца, людцы добрыя! Кульгавая Анэта мела гучны голас, лупатыя, бы ў той савы, вочы... Адным словам, купіла сабе жаніха за вялікія бацькавы грошы!

Вырашыла Зоська выйсці замуж абы

за каго. Няхай гэта будзе малпа абліччам, ды толькі, каб не застацца ў дзеўках. Дый жаніх хутка знайшоўся. Праўда, стараваты, лысы. Але ж Пахом жыў не ў рабочым інтэрнаце, а ў сваіх апартаментах. Зразумела, гэта была адзіная магнітная кропка, якая прыцягвала дваццацігадовую вясковую дзяўчыну.

Вядома ж, Зоська ніколі не пакахае свайго кавалера. Але што рабіць? Антося купілі за даляры, і спадзяванні, нібыта зоркі, патухлі. Значыць, трэба збірацца замуж за таго, хто бярэ... І, калі Пахом прапанаваў прыгажуні руку і сэрца, Зоська адразу дала згоду.

Вырашылі распісацца ў вёсцы, дамовіліся аб сустрэчы на чыгуначным вакзале. Нявеста праплакала ў падушку ўсю ноч. Выходзіць замуж за нялюбага не вельмі хацелася. Але ўранні падыбала ў бок прыгараднага вакзала, нехаця адчыніла дзверы. Там, на лаўцы, сядзеў яе будучы муж – задаволены і вясёлы. Позіркі іхнія сустрэліся. І адбылося вось што. Пакуль жаніх збіраў торбы, нявеста дала лататы. Знікла. Бо хлусня, як алей, заўсёды выйдзе наверх.

Пабегла Зоська ў свой рабочы інтэрнат, зашылася ў прыбіральню. А Пахом – следам. Абдурыўшы вахцёрку, паімчаўся на трэці паверх, пастукаўся ў знаёмы пакой. Адчынілі дзверы дзяўчаты, а Зоські – няма. Дзе ж яна? Сяброўкі толькі пацiснулі плячыма. Кінуўся Пахом у іншыя дзверы, дзе, на яго думку, павінна знаходзіцца нявеста. І там няма. Пачаў шпацыраваць па калідоры – злосны такі, чырвоны. Відаць, спадзяваўся пабачыць дзеўку ды скабы палічыць.

Зоська амаль тры гадзіны "адпачывала" ў прыбіральні. Шмат чаго перадумала, паплакала ды пасмяялася з сябе. Вырашыла больш так не "жартаваць", а чакаць сваё сапраўднае каханне. Бо, як кажуць, не памогуць і чары, як каму хто не да пары!

## ГАРБУЗ

У школьныя гады, пэўна, кожны вучань імкнуўся прадэманстраваць атрыманыя веды на справе. Бо практыка – самы надзейны фундамент.

Неяк вяртаючыся з поплава (куды хад-

зіла па шчаўё), вырашыла занатаваць імёны цётак-суседак на гарбузах, якія вытыркнуліся каля мяжы. Пра гэтую падзею я хутка забылася. Бо ў вёсцы спраў хапае і старым, і малым.

Надыйшоў час касіць бульбоўнік. Цётка Ганна таксама захапілася працай. Але, калі ўбачыла сваё імя на агародніне, не на жартачкі спалохалася. Пакруціла яна галавой туды-сюды, заўважыла яшчэ "аўтографы" сваёй матулі і сястры Вольгі. Перахрысцілася, войкнула, ды куляй пабегла ў хату.

Праз некалькі хвілін Ганна з Вольгай пашыбавалі на свой агарод, нахіліліся да аднаго гарбуза, потым – да другога... Цётка Вольга не вытрымала, залемантавала на ўсё наваколле:

– Людцы, родныя, ратуйце! Хтосьці нам падрабіў... Во якія літары тут з'явіліся!

Дзед Авілей якраз тады кляпаў касу, збіраўся касіць бульбоўнік. Зацікавіўшыся суседкіным віскам, падыбаў да сясцёр. Выслухаўшы аповед, палашчыў далонямі вялізны гарбуз ды кажа:

– Зусім здурнела маладзіца. Чаго ты

тут крычыш, палохаеш людзей? Ці забылася пра ўрокі батанікі?

Доўга цешыліся вяскоўцы над гэтай гісторыяй, смяяліся, успамінаючы падрабязнасці. Але пра сябе зрабілі выснову: трэба болей чытаць прэсу, а не малоць языкамі абы-што на прызбе...

## СЯБРОЎКІ

Зоська з Гэляй сябруюць здаўна. Амаль з маленства. Разам бегалі ў школу, на танцы, у кіно... Потым – замуж павыходзілі, нарадзілі дзетак. І жывуць сяброўкі ў адным доме, нават на адным паверсе – шостым. Дый працуюць разам.

Неяк вяртаючыся з другой змены, жанчыны папалі ў непрыемную гісторыю. А было гэта так. Толькі завярнулі яны за вугал Палаца культуры хімікаў, як з цёмнага кустоўя данеслася да іх:

– Зірні, дзеўкі ідуць. Давайце пазнаёмімся...

Раптам затрашчалі кусты, пачуўся мужчынскі тупат. Адчуўшы небяспеку, Зоська з Гэлькай здранцвелі не на жартачкі. Такая сустрэча нічога добрага

не абяцала. Маланкай сіганулі думкі – што рабіць, каб выратавацца ад вылюдкаў?

Здагадлівая Гэлька, тузануўшы сяброўку за руку, прашаптала:

– Галоўнае, не разгубіся. Рабі, як я. Інакш – прападзём...

Калі талака выпівакаў выскачыла на сцежку, то ўбачыла такі малюнак: метраў за сто ад іх кандыбалі дзве гарбатыя бабулі...

А дзеўкі, нібыта скрозь зямлю праваліліся. Паглядзелі па баках, пашукалі пад ялінамі – няма... Быццам, нейкі прывід быў. Мацюкнуліся мужыкі, плюнулі ўслед старым, ды зноў схаваліся ў цёмны куток.

## АБІБОК

Янку ўжо шаснаццаць гадоў – моцны, шыракаплечы. І рост ў яго што трэба! Амаль два метры. Усё, як бачыце, добра, прырода ўзнагарадзіла ўсім: і ростам, і здароўем. І прыгажосцю. Дрэнна толькі адно – хлопец вельмі лянівы.

У чарговы раз, калі малодшая сястра Віка папрасіла брата дапамагчы прыбраць у кватэры ды вынесці смецце на вуліцу,

той нечакана заенчыў. Ды так, што хоць вушы затыкай.

Пачуўшы гэтую "песню", прыбегла маці з кухні. Спалохана запыталася:

– Што з табою, сынок?

Янка, схапіўшыся за жывот, енчыў на ўсю хату:

– Ой, ой! Баліць...

Сястра, бы страказа, адразу паляцела да тэлефона, каб выклікаць хуткую медыцынскую дапамогу. Убачыўшы яе намеры, хітры абібок захваляваўся:

– Не трэба! Дайце мне ношпу...

Маці прынесла лекі, кубачак вадзіцы. Выжлукціўшы ваду, "хворы" зморшчыўся і кіруе да канапы.

Праз некаторы час, калі матуля з сястрой навялі "марафет" у кватэры, Янусь са смакам пацягнуўшыся, азіраецца па баках. Потым ціхенька дыбае да дзвярэй і знікае...

## ЖАБРАЧКА

Аднойчы да Настулі Кадаўбы зазірнула цыганка-жабрачка. Адчыніўшы дзверы, гаспадыня тады не на жартачкі злякала-

ся. Ды так, што нават у пяты закалола. І было ад чаго трымцець, нібыта асінавы ліст. Гэта такія маладзіцы, якім, як гаворыцца, пальцы ў рот не кладзі! Дый у мясцовых газетах рэгулярна паведамляюцца розныя непрадказальныя сітуацыі...

Але нязваная госця была прыстойных паводзінаў: не лезла напралом у хату, не пагражала халоднай зброяй, не пшыкала газавым балончыкам... Толькі стомлена зірнула ў вочы гаспадыні, ціха папрасіла:

– Даражэнькая, дай хоць штосьці для маіх дзетак! А то сухія сухарыкі глытаюць з вадзіцай.

Насця, пачуўшы такія словы, пашкадавала чарняўку, сумелася. Што ж ёй, бедалазе, прапанаваць? У кішэнях – мяцеліца гуляе, адзенне разам з абуткам таксама жадаюць стаць лепшымі. І не дзіўна. Заробкі ж сёння не надта вялікія, не пашыкуеш. Дый тыя затрымліваюць... Таму адразу прапанавала сваёй "госці" лусту хлеба з салам.

Цыганка, пачуўшы пра такія пачастункі, навастрыла вушы, хмыкнула:

– Што ты мне прапаноўваеш, мілая!

Хадзі бліжэй, глянька чым мяне частуюць!

Насця далікатна стрэліла вачыма на торбу, дзе апетытна віднеўся добры кавалак каўбасы, непрыкметна пракаўтнула сліну... Тым часам вабная кабета патупала ў кватэру ды прама на кухню. Выхапіла з торбы цэлую палку каўбасы, узялася за нож і кажа Насці:

– Сядай, не саромейся, даражэнькая! Як мовіцца ў народзе: любіш узяць – любі і аддаць...

Настулі нічога не заставалася, як плюхнуцца побач з цыганкаю. Пасядзілі жанчынкі разам, пасмакавалі каўбасы, духмянай гарбаты, пагаманілі пра тое-сёе. Развіталіся цёпла, нібыта даўнія сяброўкі...

## КОНЮХ

– Кім ты будзеш, Пятрусь, як станеш дарослым? – пыталіся ў хлопчыка вяскоўцы. Той, пачухаўшы нос, з якога заўсёды штосьці капала, нязменна талдычыў:

– Конюхам.

– А браты твае – Міхась і Шурык – кім будуць?

– Мішка – брыгадзірам, а Шурык –

старшынёй калгаса! – ганарліва хваліўся Пятрусёк, падцягваючы старэнькія штонікі.

Пачуўшы такія словы, цёткі смяяліся, цешыліся над малым. Бо ведалі, што сям'я Сынклеткі бедная, муж загінуў на вайне. Адным словам, ніякай дапамогі не было. Дый хлопцы хадзілі ў латаных штоніках і кашулях. Меркавалі: падрастуць, а там, глядзі, трэба ж зарабляць на лусту хлеба, каб не пухнуць ад галадухі. Не да вучобы!

Браты, зразумела, выраслі, бы тыя дубкі – моцныя шыракаплечыя. Уздымалі цаліну, служылі ў войску, вучыліся... Потым сталі працаваць у горадзе. Ды не рабочымі, а вялікімі начальнікамі. Вядома ж, толькі адзін Пятрусь, нягледзячы на пасаду, застаўся "конюхам".Назаўсёды. Так яго клічуць і сёння аднавяскоўцы.

## БУДЗІЛЬНІК

Цётка Матрона працавала вартаўніком у адной важнай установе. Але яна не так вартавала, як крала... Ніколі не вярталася "працаўніца" дахаты з пустымі рукамі,

заўсёды штосьці ды прыхопіць. Няхай гэта будзе хоць адзін цвік, ды нейкая карысць для гаспадаркі.

Аднойчы Матрона з незачыненага кабінета прыхапіла... будзільнік. Аб тым, што гэтую рэч гаспадыня завяла "на званок" – злодзей не ведаў. І, калі цётка важна шпацыравала праз прахадную, у яе торбе галасіста "заспяваў" крадзены будзільнік. Вядома ж, часы анулявалі, пратакол склалі...

Для цёткі наступілі змрочныя часы. Матрону не толькі панізілі ў званні – стала дворнікам, але і назаўсёды да яе прыкіпела трапная мянушка –Будзільнік.

## КУЛАГА

Паснедаўшы, Янусь зазіраў да суседзяў. Тыя заўсёды ў малога пра штосьці пыталіся. У асноўным гамонка пераключалася на харчовую хвалю.

– Ну, што сёння сёрбаў, Янусёк? – цікавілася цётка Дуня, хітра прыжмурыўшы вочы.

– Кулагу, – адказваў хлопчык, аблізваючы вусны.

– А ты ж учора таксама гаварыў пра гэтае. Мо забыўся?

Янусь круціў галоўкай, потым хваліўся, што маці заўсёды гатуе вельмі смачную кулагу. Таму яны ўсёй сям'ёй штодзень смакуюць салодкую страву.

Непрыкметна да малога літаральна прыліпла новая мянушка. Ды так, што Кулагай яго клікалі да самай апошняй хвіліны жыцця...

## РАННІЯ ПАМІДОРЫ

– Гэй, не праходзьце бокам, а набывайце найлепшы гатунак ранніх памідораў! Расада выдатная, не пашкадуеце, – зычна крычыць мажная маладзіца на рынку.

Зацікавіўшыся рэкламай, купляю сабе пяць штук. Хай радуе вока міні-агарод на балконе. А цудоўны водар напомніць далёкае дзяцінства і вёску.

Але ранняга ўраджаю з гэтай расады мы не дачакаліся. Нібыта бадзякі на пустэчы, яна прасядзела цэлае лецейка, так і не зацвіўшы...

## ЗЯМЛЯЧКА

Цэнтральны рынак заўсёды віруе асаблівым жыццём. Тут з раніцы і да самага вечара таўчэцца стракаты люд, пануюць адметныя законы. Гандлююць на базары вопраткай, абуткам, кніжкамі, цвікамі, садавінай, гароднінай... Ад гэтага дабра – разбягаюцца вочы. Але сёння мне патрэбна бульбачка – другі беларускі хлеб. Як на тое, ужо пераваліла за поўдзень, а гандляры бульбай, верагодна, сядзяць дома ды лічаць свае грошы.

Выйшаўшы за браму, прыкмячаю вясковую кабету з вялікай торбай, а каля яе - жабрачку. Напэўна, бабулька спадзявалася на чарговую міласціну. Але, відаць, намаганні былі дарэмнымі...

– Колькі каштуе бульба? – пытаюся ў загарэлай маладзіцы.

Пачуўшы адказ, нечакана бянтэжуся. Цётка запатрабавала надта шмат “зайцоў”. Цікаўлюся далей: маўляў, адкуль жа сюды завіталі?

– Са Жгуні, што за Добрушам, - адказвае жанчына.

– Дык мы ж землякі! – весялею я. І чамусьці ў душы спадзяюся на гэты факт. Зямлячка абавязкова павінна крышачку скінуць высокую цану. Дый бульбачка ж, шчыра кажучы, не вельмі якасная.

Вядома, гэтае паведамленне зацікавіла на нейкі момант гандлярку. Нібыта міліцыянер, удакладніўшы пра мае родныя мясціны, адразу перайшла на сардэчнае "ты"... І кінулася ў цёплыя абдымкі ўспамінаў.

Вытрымаўшы належную паўзу, пачціва ўстаўляю:

– Можа, хоць крышку ўступіце, а?

Пачырванеўшы, як спелая вішня, зямлячка адразу сцірае ўсмешку з вуснаў, адмоўна круціць галавой.

Уздыхнуўшы, усё-такі купляю бульбу. А што рабіць, калі дома няма ні адзінага клубня. А на балконе – бульба не расце! Тупаючы ў бок прыпынку, абагульняю падзею. Міжволі думаю: "У такіх, як мовіцца, і ўзімку снегу не выпрасіць"...

## ЗНАЁМСТВА ПА ШЛЮБНАЙ АБ’ЯВЕ

У свае трыццаць гадоў Анэля была маладжавай і вельмі вабнай. Але жаніхі чамусьці не беглі ўслед, не прапаноўвалі палкія сэрцы... Адчуўшы, што яе чакае адзінота, вырашыла купіць папулярную газету “Двое”. Знайшла там нядрэнную кандыдатуру, напісала ліст незнаёмцу. Праз некаторы час атрымала паштоўку, а потым даволі тоўсты канверт. Дрыжачымі рукамі адрэзала нажніцамі белы вугалок, выцягнула ліст з фотаздымкамі. На Анэлю глянулі выразныя вочы. А які чуб у жаніха! Цэлы стог на галаве. Адным словам, жаніх што трэба: і прыгожы, і разумны, і почырк адметны.

Завязалася перапіска. Пісьмы з Магілёва ляцелі амаль кожны дзень – радасныя, пяшчотныя, даверлівыя. Нарэшце прыйшла пара падумаць пра сустрэчу. Бо Янусь, тэлефануючы ў Гомель, прасіў аб гэтым. Анэля таксама праяўляла цікаўнасць да свайго “завочніка”. Сустрэчу прызначыла на чыгуначным вакзале, бо не хацела адкрываць свае сапраўдныя каардынаты. Беражонага, як

кажуць, і сам Бог беражэ. Дый жаніха трэба добра праверыць, таму што на свеце шмат розных прахадзімцаў швэндаецца.

У суботу Анэля паехала ў цэнтр горада. У скверыку ўбачыла высокага мужчыну з густым чубам. Падыйшла, павіталася. Янусь радасна ўсміхнуўся ў адказ, працягнуўшы шырокую далонь. Прыселі на вольную лаўку, пазіраючы адзін на аднаго. Размова чамусьці не атрымалася. Анэля інтуітыўна адчувала, што гэты чалавек – зусім чужы ёй. Мажліва, па гэтай прычыне не нараджалася цяпло, а вырастала халодная сцяна.

Сумненні хутка пацвердзіліся. Калі Янусь паказаў даведку, дзе гаварылася аб трагічнай смерці былой жонкі, увагу прыцягнулі такія падазроныя радкі: "...колата-рэзаныя раны". Гэта вельмі насцярожыла пільную гамяльчанку. Адкуль могуць з'явіцца гэтыя "аўтографы" ў жанчыны, якая гіне ў аўтамабільнай аварыі?

Пастаралася заставацца спакойнай, ветлівай і ўсмешлівай, хоць галаву, нібы цвікі, пяклі гаротныя думкі. Правёўшы "жаніха" да патрэбнага вагона, развіталася, нават шчыра цмокнула яго ў шчаку.

Янусь задаволена пазіраў ў сінія вочы нявесты, будаваў планы на будучыню. На гэтым і развіталіся, каб хутка сустрэцца зноў. Ды сустрэча не адбылася. Як толькі цягнік рушыў ад станцыі, Анэля подбегам кінулася на тэлеграф.

Патэлефанаваўшы Янусёвай сястрыцы, шмат чаго карыснага пачула ад яе мужа. Гэты добры чалавек, паспачуваўшы гамяльчанцы, адкрыў невядомую старонку з біяграфіі магілёўскага жаніха, пацвердзіў яе здагадкі. Так, сядзеў гэты прыгажун у турме. Цэлых 10 год. Бо, калі быў у добрым падпітку, то асабістымі рукамі забіў нажом жонку. Маленькі сын выхоўваўся ў дзіцячым доме, а цяпер ён амаль дарослы хлопец.

Так што давярай, але і правярай. За прыгожай знешнасцю і напускной ветлівасцю часам хаваюцца жорсткасць, подласць і садызм...

## ДЗЯВОЧЫЯ ПРЫГОДЫ

Неяк Лёлька прапанавала сваёй сяброўцы: маўляў, давай з табою паспытаем малачка... ад нашай Хаўронні. Вунь як парсючкі смакуюць гэтае дабро. Аж

завідкі бяруць! Пэўна, малако карыснае. Бо недарэмна ж парасяткі такія ружовыя ды вясёлыя.

Люська здзіўлена вылупіла вочы. Атрымалася, бы ў той прымаўцы: хоць дой быка, але дай малака. Асе суседка, засмяяўшыся, дала нырца ў сенцы, за міскай. Потым гучна падала каманду: «Садзіся на хрыбетнік Хаўронні, ды не бойся! Трымайся мацней за шэрсць, каб яна не дала лататы.»

Люська паслухмяна ўселася на свінню, як на цёплую лаву. "Даярка" тым часам рабіла сваю справу. Але нядоўга. Бо жывёліна, нібы ачмурэлая, раптам заверашчала на ўсе лады, жвава ўскочыла на кароткія ножкі. І куляй панеслася да дзіркі ў плоце.

На нейкі момант Люська здранцвела – сядзела, як цвік, ніяк не магла адарвацца. З жахам уяўляла, што яе чакае. І не памылілася. Праз нейкую хвіліну з дзявочых вачэй пасыпаўся вадаспад зіхоткіх зорак...

## ЦЫГАНСКАЕ ВЯСЕЛЛЕ

За вокнамі тралейбуса – халодны дождж. Пасажыры з сумам пазіраюць на

вуліцу. Але раптам цішыню парушае жаночы голас:

– Шаноўныя пасажыры! Зірніце, калі ласка, улева. Бо там вы ўбачыце цыганскае вяселле.

Пасажыры ўмомант ажылі, заварушыліся, прыліплі да мокрых акон. І сапраўды – вяселле! Ды яшчэ якое! Цыганскае... Нібы ў той казцы, гарцавалі зацугляныя коні, імчалі ў сямейнае жыццё дзіўную кібітку.

Пасвятлелі хмурыя абліччы, быццам вулей, загудзеў тралейбус.

Вось так бывае ў жыцці. Калі сонейка выглядае з-за аблокаў, весялеюць прырода і людзі.

ЗМЕСТ

Жаночая хітрасць . . . . . . . . . . . . . . . . 3
Народная прыкмета . . . . . . . . . . . . . . 4
Яўхім і з вады вылезе сухім . . . . . . 6
Знаходлівы сусед . . . . . . . . . . . . . . . . 8
Слёзы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 9
Што ў рацэ, яшчэ не ў руцэ . . . . . . . 10
Успамін . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 13
Спадчына . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 16
Трэба несці свой крыж . . . . . . . . . . . 21
Сустрэча . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 23
Ахвяра Бахуса . . . . . . . . . . . . . . . . 27
Атрымалі заробак . . . . . . . . . . . . . . 28
Жнівень – веснік восені . . . . . . . . . 28
Не чакай падзякі . . . . . . . . . . . . . . . 30
Хітрасць – надзейная зброя . . . . . . 34
Травень . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 38
Стэла . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 40
Жаніцьба . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 42
Як Зоська замуж выходзіла . . . . . . 44
Гарбуз . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 46
Сяброўкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 48
Абібок . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 49
Жабрачка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 50
Конюх . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 52
Будзільнік . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 53
Кулага . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 54
Раннія памідоры . . . . . . . . . . . . . . . 55
Зямлячка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 56
Знаёмства . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 58
Дзявочыя прыгоды . . . . . . . . . . . . . 60
Цыганскае вяселле . . . . . . . . . . . . . 61